*Мяньчэня Сяргей*
УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», Мінск, Беларусь

*Myanchenya Syargej*
Belarusian state agrarian technical university, Minsk, Belarus

**УДК 94(476)«1897/1914»**

# ПІЦЕЙНЫ ГАНДАЛЬ І СПАЖЫВАННЕ АЛКАГОЛЮ Ў МІНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ГАДЫ «ВІННАЙ МАНАПОЛІІ» (1897–1914 ГАДЫ)

# DRINKING TRADE AND CONSUMPTION OF ALCOHOL IN THE MINSK GUBERNIA DURING «WINE MONOPOLY» (1897–1914)

*У артыкуле разглядаецца сістэма гандлю алкагольнымі напоямі, якая была ўведзена ў выніку рэформы па рэалізацыі «віннай манаполіі». На прыкладзе Мінскай губерні паказана, што першасныя ідэі рэформы – барацьба з п'янствам, абмежаванне прыватнага сектара – былі адхілены на карысць фіскальных інтарэсаў, што прывяло да росту колькасці кропак продажу і спажывання алкаголю.*
*Ключавыя словы: вінная манаполія; антыалкагольная палітыка; спажыванне алкаголю; казённыя вінныя крамы; корчмы*

*The article is devoted to the system of trade of alcoholic beverages, which has been introduced as a result of the of the «wine monopoly» reform. On the example of Minsk gubernia the author argues, that the primary idea of reform – the struggle against alcoholism, the limitation of the private sector, were rejected in favor of fiscal interests, what led to an increase in the number of points of sale and consumption of alcohol.*
*Keywords: wine monopoly; alcohol policy; alcohol consumption; state-owned liquor stores; tavern*

З 1894 года ў Расійскай імперыі пачалася маштабная рэформа па рэалізацыі дзяржаўнай «віннай манаполіі». Афіцыйнымі мэтамі рэформы былі барацьба з п'янствам, упарадкаванне продажу і выдаленне прыватных асоб ад гандлю спіртнымі напоямі, паляпшэнне іх якасці, ліквідацыя распівачнага продажу моцных напояў. У той жа час дзяржава атрымала магчымасць кантролю над рынкам моцных напояў і прыбыткамі ад яго. Для рэалізацыі дадзенай праграмы пры Міністэрстве фінансаў ствараліся Галоўнае ўпраўленне Неакладных збораў і казённага продажу піцей і Папячыцельствы аб народнай цвярозасці. У 1897 годзе манаполія была ўведзена на тэрыторыі сямі заходніх губерняў – Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і Смаленскай.

Адным з кірункаў рэформы стала рэктыфікацыя спірту і з'яўленне новай гарэлкі – «казённага віна». «Казённае віно» існавала ў некалькіх варыянтах – віно звычайнае і віно сталовае (двайной ачысткі) моцнасцю ў 40°. У Паўднёвых, Паўднёва-заходніх, Паўночна-заходніх (беларуска-літоўскіх) і Прывіслінскіх губернях выраблялася «казённае віно» моцнасцю 57° [1, с. 36]. Разліў гарэлкі прадугледжваўся ў бутэлькі аб'ёмам 1/4, 1/20, 1/40, 1/100 і 1/200 вядра (1 вядро ≈ 12,3 л.). З улікам распаўсюджвання вынаснога гандлю асаблівай папулярнасцю карысталіся бутэлькі ў 1/100 («соткі» – 123 г) і 1/200 («кручкі» – 60 г) вядра. «Казённае віно» было лепшым па якасці ў параўнанні з папярэднікамі, якія ўтрымлівалі сівушныя масла і мала адрозніваліся паміж сабой, але мелі паэтычныя, спакуслівыя назвы – «Райская влага», «Прилепе язык», «Сиротские слёзы» [2, с. 88]. Новая назва разам з дзяржаўным гербам на этыкетцы была сваеасаблівай гарантыяй якасці, а адсутнасць іншых назваў была дастаткова чэсным крокам перад спажыўцом і пазбаўляла насельніцтва жадання пакаштаваць нешта новае.

Міністэрства фінансаў падтрымлівала тэзіс, што ўзровень спажывання алкаголю не залежыць ад колькасці кропак продажу, у выніку чаго была створана шырокая сетка крам і ўстаноў, іх колькасць вызначалася трохгадовым планам, які прымаўся Галоўным упраўленне Неакладных збораў і казённага продажу піцей пасля ўзгаднення з Папячыцельствам аб народнай цвярозасці. Замест ліквідаваных корчмаў ствараліся казённыя вінныя крамы, ці манапалькі, якія прадавалі гарэлку толькі на вынас. Час продажу «казённага віна» жорстка рэгламентаваўся. У гарадах манапалькі працавалі з 7 да 22 гадзін, у сельскай мясцовасці ў перыяд з красавіка па жнівень да 22 гадзін, у астатні час – да 20. У нядзелю і іншыя святочныя дні продаж ажыццяўляўся толькі пасля завяршэння літургіі да 20, а ў зімовы час да – 18 гадзін. Цалкам забараняўся продаж у пяток Страснога тыдня, першы дзень Вялікадня і Нараджэння Хрыстова, на час валасных сходаў і судоў, мабілізацыі, калі крама знаходзілася паблізу прызыўнога ўчастка, у выпадку смерці сідзельца ці члена яго сям'і, калі тыя жылі ў памяшканні, звязаным з крамай, да моманту вынасу цела, заразнай хваробы адзначаных асоб да моманту дэзынфекцыі памяшкання [1, с. 46–47]. Продаж ажыццяўляўся толькі за грошы, браць за гарэлку рэчы, прадукты, прадаваць у доўг забаранялася. Для забеспячэння манаполек у паветах ствараліся вінныя склады. Колькасць манаполек у губерні зацвярджалася міністрам фінансаў і вызначалася памерам насельніцтва і значэннем населенага пункта. Манапалькі адчыняліся ў гарадах, мястэчках, паселішчах, якія мелі прамысловае і гандлёвае значэнне. У сельскай мясцовасці ў малых населеных пунктах за жыхарамі заставалася магчымасць складання грамадскіх прысудаў на зачыненне манаполек і прыватных устаноў, якія знаходзіліся на зямлі грамады і спрыялі пашырэнню п'янства, але ў выпадку выяўлення ў мясцовасці нелегальнага гандлю яны скасоўваліся.

У цэлым жа бюракратычная машына рабіла рэалізацыю такіх прысудаў фактычна немагчымай.

Адказна падыходзілі і да асоб сідзельцаў манаполек – гандляроў, якія павінны былі быць «цвярозымі і ва ўсіх адносінах добранадзейнымі» [1, с. 39]. Былыя ўладальнікі корчмаў да гэтай працы не дапускаліся, лепшымі кандыдатамі лічыліся жанчыны. Жанчына разглядалася як асноўны вораг п'янства, а сама сістэма вынаснога гандлю была звязана з надзеяй на тое, што спажыванне алкаголю набудзе хатні характар і пяройдзе пад кантроль сям'і, дзе жонкі ці маці не дазволяць мужыкам піць празмерна, але гэтыя надзеі не спраўдзіліся – п'янства выйшла на вуліцы.

Цалкам ліквідаваць прыватныя ўстановы задача не ставілася. Захаванне асобнай колькасці корчмаў было неабходна для арганізацыі харчавання і начлегу грамадзян. За прыватным сектарам заставаўся і гандаль напоямі, на якія не распаўсюджвалася манаполія – у першую чаргу півам, мёдам, вінаградным віном. Для арганізацыі прыватных кропак продажу ўводзілася патэнтная сістэма. Патэнт выдаваўся Міністэрствам фінансаў пасля разгляду заяў упраўляючым Акцызнымі зборамі і губернатарам. У выпадку, калі заяўкі былі раўназначныя, выбар рабіўся на карысць больш добранадзейнай асобы. З 1900 года, каб пазбавіцца ад падстаўных асоб, патэнты сталі насіць імянны характар.

Пасля адстаўкі з пасады міністра фінансаў С. Ю. Вітэ (1892–1903) і прызначэння У. М. Какаўцова (1904–1905, 1906–1914) характар правядзення рэформы і адносіны да прыватнага сектара змяніліся. У гэты час скарачаецца фінансаванне Папячыцельстваў аб народнай цвярозасці, а прыбыткі ад манаполіі ідуць на «латанне» бюджэта (пачынаецца час так званага «п'янага бюджэта»). З мэтай павышэння прыбыткаў ад выдачы патэнтаў колькасць запланаваных прыватных устаноў значна павялічылася. Такім чынам, на першае месца замест дэклараванай барацьбы з п'янствам выходзяць фіскальныя інтарэсы.

З дапамогай статыстычных і архіўных крыніц можна прасачыць змены ў рэалізацыі палітыкі «віннай манаполіі» і яе эфектыўнасці на прыкладзе Мінскай губерні. Першыя вынікі былі дастаткова супярэчлівыя, што бачна са справаздач павятовых прадвадзіцеляў дваранства, якія з'яўляліся старшынямі мясцовых Папячыцельстваў аб народнай цвярозасці, і службовых асоб. У 1898 годзе аб паспяховасці рэформы і змяншэнні п'янства дакладвалі з Рэчыцкага і Барысаўскага паветаў [3, арк. 26, 27]. Прадвадзіцель дваранства Мазырскага павета звязваў некатарае змяншэнне п'янства толькі з павышэннем кошту на гарэлку [3, арк. 6]. З Слуцкага павета паведамлялі, што тут асаблівага п'янства неназіралася і да манаполіі, але, па водгуках святароў, насельніцтва стала піць менш і больш наведваць царкву [3, арк. 5]. У Пінскім павеце за год існавання манаполіі п'янства зменшылася, але насельніцтва пачало піць на вуліцы, а вось у самім Пінску сітуацыя не змянілася з прычыны значнай колькасці

манаполек і корчмаў [3, арк. 3–4]. У Навагрудскім павеце п’янства не толькі не зменшылася, але і пашырылася [3, арк. 30]. З Мінска і Мінскага павета прыйшлі тры розныя справаздачы. Наглядчык Мінскага акцызнага праўлення паведамляў, што ў павеце п’янства значна зменшылася, а мінскі павятовы прадвадзіцель дваранства дакладаў, што змяншэнне п’янства адбылося толькі за першую палову года ад увядзення манаполіі, а потым зноў пачаўся рост. У Мінску, згодна з рапартам паліцмейсцера, эфект ад манаполіі быў незаўважным [3, арк. 15, 10, 11].

Дзякуючы змястоўным статыстычным аглядам, якія друкаваліся ў «Памятных кніжках…», можна прасачыць дынаміку колькасці кропак продажу і спажывання алкаголю (табліцы 1, 2) [4, с. 6; 5, с. 119; 6, с. 90–91; 7, с. 106 ; 8, с. 120; 9, с. 136–137; 10, с. 88; 11, с. 103; 12, с. 91; 13, с. 65; 14, с. 85; 15, с. 93; 16, с. 102; 17, с. 76]. З разглядаемага перыяду адсутнічаюць толькі дадзеныя за 1901 год. У агульную колькасць кропак продажу піцей уключаны часовыя аб’екты, буфеты, казённыя вінныя склады, паграбы рускіх вінаградных він, установы па вырабу воцату, але асобна яны не разглядаюцца з прычыны адсутнасці канкрэктных лічбаў па гадах ці нязначнай колькасці. У катэгорыю «корчмы», у сваю чаргу, уключаны рэстараны ўсіх разрадаў, пастаялыя двары і гасцініцы з правам продажу моцных напояў.

*Табліца 1*

**Дынаміка колькасці кропак продажу піцей па Мінскай губерні за 1898–1913 гады**

| Год | Колькасць кропак гандлю піціямі | Казённыя вінныя крамы | Піўныя крамы | Корчмы | Рэнскія паграбы |
|---|---|---|---|---|---|
| 1898 | 992 | няма дадзеных | н.д. | н.д. | н.д. |
| 1899 | 1173 | н.д. | н.д. | н.д. | н.д. |
| 1900 | 1020 | н.д. | н.д. | н.д. | н.д. |
| 1902 | 808 | 432 | 106 | 65 | 59 |
| 1903 | 1078 | 563 | 200 | 60 | 62 |
| 1904 | 1188 | 556 | 283 | 70 | 65 |
| 1905 | 1144 | 556 | 261 | 73 | 63 |
| 1906 | 1150 | 550 | 262 | 65 | 64 |
| 1907 | 1353 | 548 | 389 | 98 | 79 |
| 1908 | 1501 | 549 | 457 | 154 | 80 |
| 1909 | 1712 | 595 | 595 | 140 | 110 |

*Заканчэнне табліцы 1*

| Год | Колькасць кропак гандлю піціямі | Казённыя вінныя крамы | Піўныя крамы | Корчмы | Рэнскія паграбы |
|---|---|---|---|---|---|
| 1910 | 1649 | 546 | 557 | 149 | 90 |
| 1911 | 1709 | 546 | 620 | 137 | 98 |
| 1912 | 1727 | 546 | 660 | 119 | 107 |
| 1913 | 1927 | н.д. | н.д. | н.д. | н.д. |

Аналізуючы дынаміку колькасці кропак продажу алкагольных напояў (табліца 1), можна адзначыць рост іх колькасці, асабліва пасля 1903 года, за кошт установ прыватнага сектара. У той час як агульная колькасць кропак продажу з 1898 па 1913 год павялічылася на 194 %, колькасць казённых вінных крам павялічылася з 1902 па 1903 год на 125 %, а напрацягу 1903–1912 гадоў скарацілася на 3 % (з 563 да 546), колькасць піўных павялічылася за адпаведны перыяд з 106 да 660 (+622 %), корчмаў – з 65 да 119 (+183 %), рэнскіх паграбоў – з 59 да 107 (+181 %).

Продаж моцных напояў заставаўся ў кампетэнцыі дзяржавы. Так, згодна з планам на размеркаванне кропак продажу піцей на 1910–1912 гады ў Мінскім павеце дзейнічала 69 манаполек (з іх 20 у Мінску), і 22 карчмы (11 у Мінску, пры наяўнасці яшчэ трох патэнтаў, двух у Ракаве, па адной у Астрашыцкім Гарадку, Койданаве, Негарэлым, Заслаўі, Івянцы і Самахвалавічах) [18, арк. 3–4]. Захоўвалася тэндэнцыя і на падтрыманне вынаснога гандлю. Сельская мясцовасць была цалкам пазбаўлена корчмаў, што, у сваю чаргу, вяло да зменаў у культуры спажывання алкаголю (вулічнае п’янства) і спрыяла развіццю арганізацыі таемных корчмаў з прычыны адсутнасці легальных месцаў адпачынку і харчавання.

Распаўсюджванне піўных як аб’ектаў прыватнага сектара было звязана з праектам па змене структуры спажывання алкаголю і замене гарэлкі півам. Садзейнічаў гэтаму прыняты 22 красавіка 1906 года закон, які значна спрашчаў працэдуру адкрыцця піўных [19, с. 101].

Статыстыка рэалізацыі ў межах губерні спірта і алкагольных прадуктаў (табліца 2) уключае тры пазіцыі – спірт, піва і мёд. Дадзеныя па іншых напоях у статыстычных аглядах адсутнічаюць. Пры разглядзе статыстыкі спажывання спірту трэба звярнуць увагу на сістэму вымярэння. Калі па піву і мёдзе дадзеныя падаюцца ў вёдрах, то для спірту – у градусах. Дзеля атрымання лічбы ў вёдзернай сістэме колькасць градусаў трэба падзяліць на моцнасць алкаголю. Так, узровень спажытага ў Мінскай губерні ў 1913 годзе спірту (62966644°) будзе адпавядаць 1574166,1 вядру 40° гарэлкі ці 1104678 вёдрам 57°, але, улічваючы розную моцнасць гарэлкі (40° і 57°) і спірту (90° і 95°), дадзеныя лічбы не будуць дакладнымі.

*Табліца 2*

**Спажыванне спірту і алкагольных напояў па Мінскай губерні за 1898–1913 гады**

| Год | Спажыванне спірту (у градусах абсалютнага спірту) | Спажыванне піва (у вёдрах) | Спажыванне мёду (у вёдрах) |
|---|---|---|---|
| 1898 | 40244695° | 256 515 | 6840 |
| 1899 | 42937648° | 265 794 | 6987 |
| 1900 | 56081094,7° | 216 017 | 5726 |
| 1902 | 36116880° | 290 819 | 9470 |
| 1903 | 37514905° | 160 089 | 9749 |
| 1904 | 49261000° | 179 042 | 10 731 |
| 1905 | 46893307° | 303 352 | 12 681 |
| 1906 | 59349580° | 283 595 | 13 979 |
| 1907 | 59071332° | 378 600 | 14 117 |
| 1908 | 53082860° | 436 378 | 12 759 |
| 1909 | 55153712° | 406 094 | 12 034 |
| 1910 | 50593254° | 381 401 | 22 134 |
| 1911 | 56386551° | 445 057 | 24 616 |
| 1912 | н.д. | н.д. | н.д. |
| 1913 | 62966644° | 492 324 | 24 102 |

Спыніць рост спажывання спіртных напояў палітыка «віннай манаполіі» здолела толькі на пачатковым этапе, але з 1904 года пачынаецца імклівы рост па ўсіх пазіцыях. На практыцы пацвердзіўся тэзіс аб тым, што спажыванне алкаголю не залежыць ад колькасці кропак продажу, але толькі ў дачыненні да спірту і гарэлкі, на якія распаўсюджвалася манаполія. Пры дастаткова стабільнай колькасці кропак продажу рост спажывання спірту па губерні склаў +156 %. Адметна, што прасочваецца ўзаемасувязь паміж спажываннем спірту і піва. Так, калі ў 1907 годзе насельніцтва Мінскай губерні спажыло менш спірту ў параўнанні з папярэднім годам (-278248°), гэта кампенсавалася ростам спажывання піва (+95005 вёдзер). Аналагічнае павышэнне спажывання спіртных напояў у 1908 годзе суправаджалася змяншэннем спажывання піва.

У рацыён жыхароў Мінскай губерні ўвайшло піва – рост спажывання склаў амаль +194 %, але ва ўмовах адсутнасці распівачных ужывалі яго пераважна ці на вуліцах, ці дома, ці ў таемных корчмах. Але пры агульным разглядзе бачна, што за гады «віннай манаполіі» структура спажы-

вання алкагольных напояў змянілася нязначна. Так, у перакладзе на 57° гарэлку ў 1898 годзе на 1 вядро піва прыходзілася 2,75 вядра гарэлкі, а ў 1913 годзе – 2,24.

Асобна стаіць спажыванне мёду. За гады манаполіі яго рост склаў +352 %. Мёд спажываўся як асобны алкагольны напой, так і ў сумясі з іншымі. Вядомы выпадкі, калі ім разводзілі гарэлку для атрымання больш моцнага эфекту. Але больш вядомы ён быў як кампанент для пераварвання дэнатуратнага спірту. Магчыма, менавіта са зніжэннем у 1909 годзе акцыза на дэнатуратны спірт звязаны той імклівы рост (+184 %), які паказаў продаж мёду ў 1910 годзе.

Рост спажывання алкагольных напояў да 1913 года, разам з ростам колькасці кропак продажу, сведчыць аб неэфектыўнасці палітыкі «віннай манаполіі» і неадпаведнасці яе дэклараваным прынцыпам. Рост спажывання меў агульнадзяржаўны характар, аб чым сведчаць даныя, якія прыводзіць у сваёй манаграфіі Т. С. Процька [20, с. 21] (табліца 3):

*Табліца 3*

**Спажыванне алкагольных напояў на душу насельніцтва (у вёдрах)**

| | **1907** | **1911** | **1912** | **1913** |
|---|---|---|---|---|
| Мінская губерня | 1,98 | 2,02 | 2,12 | 2,21 |
| Сярэдняе па Расійскай імперыі | 3,1 | 2,76 | 2,85 | 3,25 |

Неабходнасць перагляду палітыкі была відавочная, і ў студзені 1914 года перад новым міністрам фінансаў П. Л. Баркам Мікалай II паставіў задачу па выпраўленні існуючай сістэмы і адмовы ад практыкі «п'янага бюджэту»: «Нельзя ставить в зависимость благосостояние казны от разорения духовных и хозяйственных сил множества Моих верноподданных…» [21, с. 136].

Такім чынам, на тэрыторыі Мінскай губерні за гады існавання «віннай манаполіі», насуперак абвешчанай палітыкі барацьбы з п'янствам, назіраўся рост як колькасці кропак продажу алкагольных напояў, так і ўзроўню іх спажывання. Адхіленне ад першасных мэтаў рэформы прывяло да росту ўзроўню спажывання і колькасці кропак продажу прыватнага сектара, што праявілася ў значным павелічэнні колькасці піўных і корчмаў, а вынасная сістэма гандлю выклікала змены ў культуры спажывання алкаголю (вулічнае п'янства, адсутнасць закускі). Неэфектыўнасць такой палітыкі прымусіла ўлады ў 1914 годзе паставіць барацьбу з п'янствам вышэй за фіскальныя інтарэсы.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Казённая продажа вина / издание Главного Управления Неокладных сборов и казённой продажи питей. – СПб., 1900. – 228, [252] с.

2. Памяти великого борца за народную трезвость Михаила Дмитриевича Челышева. – Петроград, 1916. – 109, [3] с.

3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (НГАБ). – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 6495.

4. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1901 год / издание Минского губернского статистического комитета; [составлена под редакцией А. Н. Замятина]. – Минск: Губерн. тип., 1900. – 224, 111, 22, 35, 49, [9] с.

5. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1902 год / издание Минского губернского статистического комитета; [составитель В. С. Ярмолович]. – Минск: Паровая типо-литография В. С. Соломонова, 1901. – 218, 212, [7] с.

6. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1904 год / издание Минского губернского статистического комитета; [составитель В. С. Ярмолович]. – Минск: Паровая типо-литография В. С. Соломонова, 1903. – 221, 157, [3], 68, [6] с.

7. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1905 год / издание Минского губернского статистического комитета; [составитель В. С. Ярмолович]. – Минск: Паровая типо-литография В. С. Соломонова, 1904. – [5], 201, 200, [6] с.

8. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1906 год / издание Минского губернского статистического комитета; [составитель В. С. Ярмолович]. – Минск: Губерн. тип., 1905. – [5], 211, 193, [4] с.

9. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1907 год / издание Минского губернского статистического комитета; [составитель В. С. Ярмолович]. – Минск: Губерн. тип., 1906. – [5], 200, 207, [15] с.

10. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1908 год / издание Минского губернского статистического комитета; [составитель В. С. Ярмолович]. – Минск: Тип. С. А. Некрасова, 1907. – [8], 200, 163, [15] с.

11. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1909 год / издание Минского губернского статистического комитета; [составитель В. С. Ярмолович]. – Минск: Тип. С. А. Некрасова, 1908. – [10], 208, 189, [3] с.

12. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1910 год / издание Минского губернского статистического комитета; [составитель В. С. Ярмолович]. – Минск: Губерн. тип., 1909. – 192, 187, III, [2] с.

13. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1911 год / издание Минского губернского статистического комитета; [составитель В. С. Ярмолович]. – Минск: Губерн. тип., 1910. –224, 188, II с.

14. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1912 год / издание Минского губернского статистического комитета. – Минск: Губерн. тип., 1911. – 224, 211, III, [5] с.

15. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1913 год / издание Минского губернского статистического комитета. – Минск: Губерн. тип., 1912. – 2, 197, III, [2] с.

16. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1914 год / издание Минского губернского статистического комитета. – Минск: Губерн. тип., 1913. – [36] 240, 189, III, [1] с.

17. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1915 год / издание Минского губернского статистического комитета. – Минск: Губерн. тип., 1914. – 232, 185, III, [26] с.

18. НГАБ. – Фонд 132. – Воп. 1. – Спр. 55.

19. *Митрофан, епископ* В борьбе за трезвость / Епископ Митрофан. – Минск: Мин. Правосл. Свято-Николаев. нар. Братство, 1913 – 190 с.

20. *Протько, Т. С.* В борьбе за трезвость / Т. С. Протько; под ред. М. О. Бича. – Минск: Наука и техника, 1988. – 162 с.

21. *Мяньчэня, С. В.* Сістэма абмежаванняў продажу і ўжывання спіртных напояў на прыфрантавой тэрыторыі беларускіх губерняў і звязаныя з ёй правапарушэнні (1914–1915 гг.) / С. В. Мяньчэня // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сб. науч. ст. по материалам междунар. конф., Пинск 21–22 окт. 2016 г. / Полес. гос. ун-т; под ред. Р. Б. Гагуа. – Пинск, 2016. – С. 136–142.

**(Дата паступлення: 30.10.2017).**

*Шевкун Павел*
УО «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Беларусь

*Shevkun Pavel*
Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Minsk, Belarus

**УДК 355.257.72(476)+94(476)«17/19»**

## ОТ ТРАДИЦИИ К МОДЕРНУ: КОММУНИКАТИВНЫЙ АСПЕКТ ИСТОРИИ ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКВИ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ (XIX – НАЧАЛО XX ВЕКА)

## FROM TRADITION TO ART NOUVEAU: COMMUNICATIVE ASPECT OF HISTORY OF THE ORTHODOX CHURCH IN THE RUSSIAN EMPIRE (XIX – EARLY XX CENT.)

*В статье затрагиваются проблемы трансформации российского общества в период XIX – начала XX века. Показана коммуникативная роль православной церкви империи, ее значение как фактора стабилизации социальных отношений. Выделены церковно-коммуникативные парадигмы, в рамках которых проходила адаптация конфессиональных структур к модерным процессам. Отмечены трудности, возникшие на этом пути. Сделан вывод о конфессио-*